№№147–148
(2875–2876)

2 кастрычніка 2008 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай і рускай мовах

Выдавец:
УП «Народная воля».
Кошт — свабодны.

На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...

Якуб КОЛАС

Народная Воля

Да ўвагі!
Хто не зрабіў перадаплату і хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!

Шаноўныя чытачы!
Па пытаннях распаўсюджвання газеты жыхары сталіцы могуць звяртацца па тэлефоне 328-63-93, усе астатнія — па тэлефоне 328-68-71.

ВЫБАРЫ: ХРОНІКА

Жывыя ў спісах выбаршчыкаў сябе не знаходзілі, затое нехта выклікаў выбарчыя камісіі ад імя памерлых

Раніца 28 верасня пачалася са скандальнага паведамлення: у Гомельскай вобласці напярэдадні вечарам на выбарчым участку адбылася масавая бойка. Пабіліся, нібыта, міліцыянеры, што прыехалі сачыць за выбарамі з абласнога цэнтра, і выбаршчыцы жыткавіцкага сельскагаспадарчага ПТВ. Што і казаць: добры пачатак...

8.00

Па ўсёй краіне адчынілі дзверы тысячы выбарчых участкаў. Старшыня ЦВК Лідзія Ярмошына радасна паведаміла, што 26% выбаршчыкаў прагаласавалі датэрмінова. Па Коласаўскай выбарчай акрузе Мінска, дзе балатаваўся лідэр ПКБ Сяргей Калякін, на некаторых участках прагаласавалі больш за 90% выбаршчыкаў (зразумела, студэнты). Карацей кажучы, галасаванне пачалося з вялікай "форы", што захоўвалася ў скрынях для датэрміновага галасавання.

9.00

Унікальны прэцэдэнт здарыўся на адным з выбарчых участкаў Гродна. Калі кандыдат у дэпутаты па Гродзенскай-Занёманскай выбарчай акрузе Сяргей Кузьмянок прыйшоў на выбарчы ўчастак прагаласаваць, выявілася, што ўсёй яго сям'і ... няма ў выбарчых спісах. Сяргей Кузьмянок кажа, што 15 гадоў ён галасаваў на гэтым участку на розных выбарах, а зараз ягоная кватэра разам з насельнікамі некуды знікла са спісаў. Больш таго, сябры камісіі не хацелі ўключаць Сяргея Кузьмянка ў спісы выбаршчыкаў. І толькі пасля таго, як кандыдат у дэпутаты заявіў, што выкліча на ўчастак прадстаўнікоў АБСЕ, камісія дала яму магчымасць прагаласаваць.

10.00

Становіцца вядома, што члены дэмакратычных партый, якія з вялікімі цяжкасцямі, але былі ўключаны ў склад акруговых камісій, не будуць мець магчымасці стаць удзельнікамі падвядзення вынікаў галасавання.

Так, у Баранавіцкай-Заходняй і Баранавіцкай сельскай выбарчых акругах, сябрамі якіх з'яўляліся члены АГП Анжаліка Камбалава і Ян Савіцкі, было прынята рашэнне аб графіку работы членаў камісій. У адпаведнасці з графікам, абодва сябры камісій ад АГП былі прызначаны працаваць... 28 верасня на першую змену. Гэта значыць, што вечарам, падчас прывозу выніковых пратаколаў і бюлетэняў з выбарчых участкаў, ім не далі магчымасці прысутнічаць і бачыць вынікі выбараў.

Ну, ці не здзек?

11.00

Галасаванне праходзіць спакойна. Вялікай колькасці людзей на выбарчых участках назіральнікі не бачаць. Аляксандр Лукашэнка падчас наведвання свайго выбарчага ўчастка спрагназаваў, што цяперашняй апазіцыі засталося існаваць "пару месяцаў". Ён выглядаў цалкам задаволеным жыццём, галасаваў разам з малодшым сынам Мікалаем, фатаграфаваўся з замежнымі назіральнікамі. Карацей кажучы, "выдаваў" атмасферу свята...

12.00

У Мазыры здарыўся цуд. У дзень, калі агітаваць нельга, у горадзе нарэшце з'явіліся... стэнды з агітацыйнымі плакатамі.

Усю перадвыбарную кампанію назіральнік Уладзімір Целяпун накіроўваў скаргі старшыні Мазырскага райвыканкама, пракурору і на ўсе магчымыя адрасы, каб высветліць, куды ж падзеліся грошы, што былі цэнтралізавана выдзелены на абсталяванне перадвыбарных стэндаў. Але стэнды так і не з'явіліся. Ажно да 28 верасня...

13.00

Назіральнікі паведамляюць, што на ўчастках для галасавання для іх адведзены такія месцы, з якіх увогуле нічога не бачна. Так, назіральніца з выбарчага ўчастка №3 Гродзенскай-Занёманскай выбарчай акругі №49 Галіна Ашмяна паведаміла, што з яе месца нават не відаць скрыню для галасавання.

Назіральнікі па мабільных тэлефонах перадаюць адзін аднаму здымкі (і гэтыя здымкі з'яўляюцца ў інтэрнеце) таго, што яны бачаць са сваіх месцаў. Як правіла — гэта нейкія кадушкі з фікусамі, якія перакрываюць увесь агляд.

14.00

Пачынаюць паступаць звесткі з так званых "закрытых" участкаў — бальніц, шпіталяў і т.п. Проста "ідэальна" галасуюць псіхіятрычныя бальніцы — 100-працэнтная яўка і поўная перамога кандыдатаў ад улады.

15.00

"Афіцыйныя" назіральнікі ўжо пішуць акты пра "чэсныя выбары".

Так, назіральнік Максім Губарэвіч здолеў зрабіць копію унікальнага па сваёй сутнасці дакумента — "Акта правядзення галасавання". Дакумент захоўваецца ў старшыні ўчастковай камісіі ўчастка для галасавання №19 Гродзенскай-Цэнтральнай выбарчай акругі №50. У ім назіральніца І.Г.Свістун ужо дала справаздачу пра тое, як праходзілі выбары: "Прысутнічала пры пламбіраванні і апячатванні скрыняў для галасавання, назірала за выдачай бюлетэняў і актыўным ходам галасавання... У ходзе назірання за правядзеннем галасавання парушэнняў выяўлена не было. Выбары прайшлі ў адпаведнасці з Выбарчым кодэксам Рэспублікі Беларусь. Прысутнічала да завяршэння падвядзення вынікаў галасавання".

Пад "Актам" стаіць подпіс назіральніка. Але копія дакумента зроблена ў 14.50. І да завяршэння выбараў застаецца болей за 5 гадзін, а да падвядзення вынікаў — яшчэ больш.

16.00

Стала вядома пра трагічны выпадак. У Барысаве ў кропцы выязнога гандлю перад участкам для галасавання №43 Барысаўскай сельскай выбарчай акругі чалавек падавіўся шашлыком. Як паведаміў апазіцыйны актывіст Сяргей Салаш, супрацоўнікі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях не змаглі выратаваць гэтага чалавека і той сканаў.

Сведкамі здарэння сталі незалежныя наглядальнікі. Яны і расказалі, што на выгляд яму было гадоў 45. Пазней афіцыйны прадстаўнік МНС пацвердзіў, што сапраўды такое трагічнае здарэнне было.

17.00

У выбарчай акрузе №30 (Лёзненскі, Сенненскі, Талачынскі раёны) выкарысталі метад галасавання — "адзін за ўсіх". Так, у вёсцы Ходцы брыгадзір Фаіна Ананенка не стала адрываць даярак і жывёлаводаў ад вытворчага працэсу. На выбарчы ўчастак №36 яна накіравалася сама. Распісалася і атрымала бюлетэні за ўсіх сваіх падначаленых, паставіла ў бюлетэнях "галачку" насупраць прозвішча "патрэбнага" кандыдата і са спакойным сумленнем апусціла ўсё ў скрыню для датэрміновага галасавання. Выдавалі брыгадзіру бюлетэні за ўсю брыгаду сябры камісіі — настаўнікі мясцовай школы.

Гэты факт афіцыйна зафіксавалі праваабаронцы і члены каманды кандыдата па гэтай акрузе Сяргея Вазняка.

18.00

Раптам высвятляецца, што па ўсёй краіне людзі масава жадаюць прагаласаваць дома. Пра гэта паведамляюць кандыдаты і назіральнікі з Мінска, Віцебска, Барысава, Бабруйска... Сяргей Антусевіч, які балатаваўся па Гродзенскай Цэнтральнай акрузе №50, расказаў, што на 4-м выбарчым участку ажно 320 выбаршчыкаў з 900 пажадалі прагаласаваць дома. Прадстаўнікі выбарчай камісіі з перанасной скрыняй аб'ехалі гэтых людзей за чатыры гадзіны.

Але давайце падлічым. Чатыры гадзіны — гэта, як вядома, 240 хвалін. І за гэты час прагаласавала 320 чалавек? На кожнага прыходзіцца менш за хвіліну, хаця са скрыняй аб'язджалі прыватны сектар... Ці могуць быць такія "рэкорды" — пытанне рытарычнае.

19.00

Назіральнік па выбарчым участку №1 па Драгічынскай выбарчай акрузе №10 паўдзельнічаў у наведванні сябрамі ўчастковай камісіі выбаршчыкаў, якія падавалі заяўкі на галасаванне па іх месцы знаходжання. Некаторыя, як высветлілася, проста не дачакаліся сябраў камісіі. І, дарэчы, па зразумелых прычынах: у адным выпадку муж з жонкай ужо год таму з'ехалі ў Расію, а ў другім "заяўка ў камісію прыйшла"... ад нябожчыка.

Дык хто ж выклікаў членаў выбарчай камісіі?

20.00

Выбарчыя ўчасткі зачыніліся. Члены выбарчых камісій адвярнуліся ад назіральнікаў "філейнымі часткамі" і моўчкі пачалі нешта рабіць з бюлетэнямі.

ЦВК абвясціў, што выбары парламента ў Беларусі прайшлі свабодна, дэмакратычна, без сур'ёзных парушэнняў.

Алег СНОЎ.

ТОЛЬКО ЦИФРЫ

Самые пассивные избиратели живут в столице

Самые активные избиратели в нынешней парламентской кампании приписаны к Полесскому округу №43, где явка составила 94,5%.

Очень активно голосовал Витебский сельский округ №21 — явка 94%.

Самыми пассивными оказались избиратели Свислочского округа Минска (именно здесь снял свою кандидатуру Александр Добровольский) — 57%, в Шабановском округе Минска №91 — 58,6%, Борисовском городском №62 — 58,7%.

ДИКОСТЬ

Виктор Гончар оказался в списке избирателей

9 лет назад известный политик, оппонент Александра Лукашенко, экс-глава Центральной избирательной комиссии был похищен вместе с бизнесменом Анатолием Красовским. Об их судьбе до сих пор ничего не известно. Но каждый раз, когда в Беларуси проходят выборы, Зинаида Гончар находит фамилию мужа в списках избирателей.

— Виктор был похищен в 1999 году, — говорит Зинаида Гончар. — За это время в стране прошло пять избирательных кампаний: три парламентские и две президентские. И всякий раз, когда я прихожу в день голосования на избирательный участок и расписываюсь за полученный бюллетень, в списках рядом со мной значится "Гончар Виктор". Я неоднократно говорила об этом членам комиссии, но они перекладывают ответственность на домоуправление, мол, там готовят списки избирателей...

Я не знаю, как расценивать эту ситуацию. Либо это обычная фальсификация, потому что всегда можно проголосовать за тех людей, которые, как известно, никогда не придут на выборы. Или же это такое психологическое давление, желание еще раз причинить боль мне, моей семье...

Виктор Гончар и Анатолий Красовский пропали спустя четыре месяца после исчезновения экс-министра внутренних дел Юрия Захаренко. В июле 2000 года домой не вернулся оператор ОНТ Дмитрий Завадский. Требование раскрыть правду об этих исчезновениях содержится в резолюциях Комиссии ООН по правам человека, Парламентских ассамблей Совета Европы и ОБСЕ. Министру внутренних дел Беларуси Владимиру Наумову, главе Администрации президента Виктору Шейману, бывшему руководителю МВД Юрию Сивакову и командиру СОБРа Дмитрию Павличенко запрещен въезд в страны Евросоюза и США из-за подозрений в их причастности к похищениям оппозиционных политиков.

Ольга ГРИНЕВИЦКАЯ.

НАБЛЮДЕНИЕ

Как голосовали на родине Лукашенко

На некоторых избирательных участках Шкловского района в досрочных выборах участвовали до 70 процентов избирателей. А в совхозе "Городец" за 5 дней за кандидата от оппозиции якобы проголосовали только 2 человека!

Своими впечатлениями от выборов на Шкловщине с "Народной волей" поделился кандидат экономических наук, член окружной комиссии по Шкловскому избирательному округу №90 Петр Мигурский.

— На родине президента на выборы шли "дружно", — с иронией замечает Петр Степанович. — На некоторых участках в день голосования, не успев открыть избирательные участки, члены комиссий уже ехали с урнами по деревням к избирателям. Например, с кандидатом в депутаты от Партии БНФ Григорием Костусевым, который баллотировался в парламент по Шкловскому округу, мы приехали в 8.40 в деревню Тударево, а там уже народ с урнами садился в машины. В Рыжковичах списки избирателей, которые нуждаются в голосовании на дому, были распечатаны в 8.10 утра. Хотя процедура выявления таких избирателей не минутное дело: надо как минимум каждому позвонить, а уже потом вносить в список.

Накануне выборов, в субботу, мы с Костусевым посетили деревню Шнаровка, поинтересовались у местного населения: мол, как будете голосовать? "А к нам выборы сами приедут, — шутили крестьяне. — Мы никогда на участок не ездим, голосуем здесь, на месте". Вроде бы мелочь, но она красноречиво показывает, как в Беларуси были организованы выборы. А вообще, стоит отметить, что в нашем округе до 50 процентов(!) избирателей проголосовали досрочно, а на некоторых участках эта цифра приблизилась до 70 процентов. Например, в Тударево 67 процентов избирателей были "досрочниками".

— А в совхозе "Городец", где директорствовал Лукашенко, как голосовали?

— Я там лично присутствовал при подсчете голосов. Электорат в этом населенном пункте неоднозначный. Я бы даже сказал, протестный. Однако... При мне были открыты урны, с которыми члены комиссий выезжали на дома в день выборов. Открывают урну из деревни Ходулы: за кандидата от Партии БНФ Костусева ноль голосов, из деревни Путники — ноль голосов, из деревни Городец — ноль голосов. Такой же "итог" досрочного голосования: за пять дней за кандидата от оппозиции проголосовало только 2 человека! Безусловно, такие результаты настораживают, потому что мне известны настроения людей данного региона.

Но самое интересное было потом.

Как член окружной комиссии по Шкловскому избирательному округу №90 после окончания голосования и подсчета голосов в участковых комиссиях я принимал документы от председателей комиссий: печать, списки избирателей и бюллетени. Рядом сидела секретарь комиссии и принимала итоговые протоколы. И вдруг вижу: член одной комиссии передает ей 4 протокола, хотя их должно быть максимум два. Если честно, я не думал, что в моем присутствии будут допускаться такие явные нарушения, однако... Заходит представитель комиссии по участку деревни Александрия — родины президента — и подает два протокола, но один пустой, а второй заполнен простым карандашом. Причем оба документа уже подписаны всеми членами участковых избирательных комиссий. Эти протоколы мне удалось изъять, и я предупредил председателя окружной комиссии Зою Борисовну Белясову, что, если подобное повторится, я буду вынужден выйти из состава окружной комиссии. Не успел я это сказать, как подают протокол комиссии №10 из деревни Бушляки, а там протоколы вообще без данных, просто пустые. И тоже подписаны всеми членами комиссии. Тут я и понял, что это система: в окружную комиссию из участковых комиссий поступают пустые протоколы.

Я тут же написал заявление о выходе из окружной комиссии, забрал эти протоколы в качестве доказательств и сообщил, что отказываюсь подписывать протокол окружной комиссии.

— Можно ли в этом случае считать, что выборы в Шкловском избирательном округе состоялись?

— Итоговый протокол должен быть подписан всеми членами окружной комиссии. Если кто-то не согласен, то должен написать пояснение, особое мнение. Но поскольку я видел, что происходит тотальная фальсификация, я вообще отказался быть членом такой комиссии, не захотел марать свое имя. Я сфотографировал эти протоколы, в Могилеве мы провели пресс-конференцию, на которой присутствовали представители миссии ОБСЕ. Написал заявление в республиканскую и областную прокуратуру, в Центральную избирательную комиссию.

В тот же день я позвонил лично секретарю ЦИК Николаю Лозовику и уведомил его о произошедшем. Но это не помешало в 23.00 ЦИКу объявить на всю страну, что председатель Шкловского райисполкома Валерий Иванов избран депутатом от Шкловского избирательного округа.

Как после таких фактов можно говорить о том, что выборы в Беларуси прошли демократично, свободно и открыто?!

— Какие итоги выборов в вашем округе были в конечном итоге озвучены?

— Я даже не интересовался этим. Какая разница, какие там написаны цифры? Я знаю то, как проходили фальсификации. Хотя, хочу отметить, что до момента голосования окружная комиссия работала хорошо, на все наши замечания реагировала. Но потом все начало идти по сценарию, который уже 12 лет остается неизменным в период выборных кампаний в Беларуси.

— Петр Степанович, не опасаетесь, что ваша позиция может стоить вам места работы? Вы же преподаете в одном из могилевских вузов.

— Угрозы в мой адрес были. Дважды мне угрожали работники Шкловского райисполкома: один раз физической расправой, второй раз — увольнением из университета. Но я не обращаю на это внимания. В конце концов, у меня есть 57 соток земли, и работать я умею...

Ольга ГРИНЕВИЦКАЯ.

АКЦЫЯ

Пратэст, які не адбыўся

На акцыю апазіцыі, якая была скіравана на патрабаванне новых выбараў, прыйшло каля тысячы чалавек.

Ідэя байкатавання парламенцкіх выбараў у Беларусі, хоць і заняла розумы некаторых палітыкаў, але належным чынам падрыхтавацца да яе правядзення яны не здолелі. У якасці інфармацыйнай пляцоўкі для правядзення акцыі арганізатары выкарыстоўвалі інтэрнет-рэсурсы і гарадскія слупы, дзе размяшчалі налепкі адпаведнага зместу. Насцярожваў і час правядзення акцыі — 20.00 28 верасня. Зразумела, што большасць патэнцыяльных удзельнікаў акцыі ў гэты час былі заняты на выбарчых участках.

Так ці іначай, акцыя распачалася... Сярод прысутных былі заўважаны Вольга і Аляксандр Казуліны, адзін з натхняльнікаў "Байкоту" Зміцер Бандарэнка, намеснік старшыні Партыі БНФ Віктар Івашкевіч і іншыя... Пратэсцавалі выйшла ў асноўным моладзь. У руках маладыя людзі трымалі расцяжкі кшталту "Мы за выборы, но против избирательного фарса", а таксама сцягі Еўрасаюза, нацыянальныя бел-чырвона-белыя сцягі і палотнішчы колеру "аранжавай" рэвалюцыі ва Украіне.

Бянтэжыла, аднак, тое, што ў арганізатараў не было яснага сцэнарыя правядзення акцыі. Пастаяўшы на Кастрычніцкай плошчы і паспрабаваўшы ўсталяваць там два намёты, удзельнікі мерапрыемства вырашылі рушыць да будынка Цэнтрвыбаркама. Міліцыя і людзі ў цывільным у тое, што адбывалася, не ўмешваліся, хаця старанна здымалі ўсё, што адбываецца, на відэа... І цалкам верагодна, што для некаторых удзельнікаў акцыі выхад на плошчу вечарам 28 верасня яшчэ адгукнецца штрафамі ці адпраўкай на "суткі".

Дайшоўшы да будынка Цэнтрвыбаркама (а частка людзей ішла па праезнай частцы, на што і звярталі ўвагу прадстаўнікі міліцыі), удзельнікі акцыі выказалі сваё стаўленне да "выбарчага фарсу" шляхам скандіравання адпаведных лозунгаў... Нехта з мітынгоўцаў з бел-чырвона-белым сцягам у руках узлез на пастамент помніка Леніну, пасля чаго людзі вярнуліся на Кастрычніцкую плошчу...

На гэтым акцыя скончылася. І сёння вядуцца сур'ёзныя спрэчкі: што ж гэта было — пратэст ці параза?

Адным з тых, хто найбольш актыўна заклікаў людзей да выхаду на плошчу, быў каардынатар "Хартыі-97" Андрэй Саннікаў. Вось як ён ацаніў вынік яе правядзення ў гутарцы з карэспандэнтам "Народнай волі":

— Я вельмі высока ацэньваю акцыю, якая прайшла ў Мінску 28 верасня, — гаворыць Андрэй Алегавіч. — Высокая ацэнка грунтуецца на тым, што акцыя, па-першае, прайшла абсалютна мірна. Падругое, людзі, якія выйшлі на плошчу, данеслі ўладам усё, што хацелі: "Не — фальсіфікацыям, не — ілжывым выбарам, і не — дыктатуры!" Людзі скарысталіся сваім законным правам і выказалі сваё меркаванне.

Што да малакольканасці ўдзельнікаў акцыі, я ацэньваю яе як нармальную. Вы ж ведаеце, у якой краіне мы жывём. Да таго ж, многія партыйныя актывісты выбралі замест выхаду на плошчу працу ў выбарчых камісіях. Хаця ўсё роўна нікога да падліку галасоў не дапусцілі...

Віталь ГАРБУЗАЎ.

АДРЕСНО

Пивная река с кисельными берегами

На избирательном участке №678 города Минска в день выборов каждому проголосовавшему давали бесплатно две банки пива — "Александрыя" и "Крыніца класічнае", а также три пачки киселя производства ООО "Крыніца".

— На президентских выборах 2006 года на нашем участке избирателей тоже встречали подарками, — рассказала "Народной воле" жительница Партизанского района Елена Борейко. — В прошлый раз кроме пива был еще квас и желе — все производства завода "Крыніца".

Возможно, на нашем участке явка и была 75,3%, как озвучила председатель ЦИК Лидия Ермошина. Во всяком случае, даже мой муж, который не собирался идти голосовать, соблазнился дармовым пивом.

Почему так "повезло" избирателям нашего участка, не знаю. Может быть, завод шефствует над школой, в которой был организован избирательный участок? Во всяком случае, в соседней 133-й средней школе подарков в день выборов не раздавали.

Игорь ЗАЛЕССКИЙ.

Народная Воля http://www.nv-online.info
2 КАСТРЫЧНІКА 2008 г.

ВЫХАВАЎЧЫ МОМАНТ

«Так, хуценька падняліся — і на датэрміновае галасаванне!»

...За два дні да выбараў — 26 верасня — па вучэбных кабінетах Мінскага дзяржаўнага політэхнічнага каледжа, дзе ішлі заняткі, хадзілі куратары груп з паперкамі ў руках. Гэта, аказваецца, былі спісы навучэнцаў, якія жывуць у інтэрнаце.

— Так, хуценька бярыце пашпарты ці вучнёўскія білеты — і ў 241-ы кабінет на датэрміновае галасаванне, — пачулі мы катэгарычны загад.

— А калі я не пайду? — было заўпарціўся адзін хлопец.

— З адміністрацыяй лепш сябраваць, — атрымаў ён папулярнае тлумачэнне. — Ведаеш, колькі жадаючых заняць тваё месца ў інтэрнаце?

Інтэрнацкія "шчасліўчыкі" мусілі падняцца з месца, перарваўшы "навучальны працэс". Я ж падумаў: нічога сабе выкананне грамадзянскага доўгу пад прымусам! Потым, пагартаўшы Асноўны закон краіны — Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь, звярнуў асаблівую ўвагу на арт.65, дзе абвешчана: "Выбары з'яўляюцца свабоднымі: выбаршчык асабіста вырашае, ці ўдзельнічаць яму ў выбарах".

Таму, калі да прыведзенага мною "выхаваўчага моманту" я яшчэ вагаўся, ісці ці не ісці на тыя выбары, то напярэдадні "народнага волевыяўлення" цвёрда рашыў не ўдзельнічаць у гэтай гульні. Яна ж замешана на хлусні і прымусе! І не толькі я адзін — многія не пайшлі, нават — во дзіва! — некаторыя бээрэсэмаўцы. Хоць выкладчыкі ўвесь час настойліва ўводзяць нам у вушы пра свабодную, стабільную, квітнеючую Беларусь, гэта, выходзіць, няшчырыя, фальшывыя словы, у якія, магчыма, яны і самі не вераць.

Што ж добрае можна пабудаваць на хлусні? І каго хочуць зрабіць з нас, маладых, каго выхаваць — палахлівых прыстасавацаў, маўклівых "вінцікаў" сістэмы, дзе нярэдка самастойнасць думкі, прыхільнасць Канстытуцыі папросту караюцца? Нездарма ж дырэктар нашага каледжа Генадзь Данатавіч Падгайскі (а ў будынку навучальнай установы быў размешчаны выбарчы ўчастак №608 Каліноўскай выбарчай акругі №108) і ягоная намесніца па выхаваўчай рабоце Ніна Мікалаеўна Леўчык так стараліся дзеля "ахопу паствы" датэрміновым галасаваннем. А раней наш каледж праславіўся тым, што некалькі навучэнцаў былі выключаны за іншадумства — праўда, з больш прыстойнай фармулёўкай "за парушэнне ўнутранага распарадку"...

Не буду казаць за ўсіх, але дапускаю: наўрад ці наш каледж — выключэнне, і падобных выпадкаў датэрміновага галасавання пад прымусам мноства. (Між іншым, саму па сабе магчымасць выкарыстаць такое права па жаданні выбаршчыка лічу зусім нядрэннай.) Таму так смешна слухаць пафасныя дыфірамбы сп.Ярмошынай "вялікай актыўнасці" грамадзян на выбарах — датэрмінова прагаласавала ажно 26 працэнтаў! Цана гэтым працэнтам, пераканаўся, даволі сумніўная.

Але галоўнае усё-такі нават не ў саміх лічбах, а ў тым выхаваўчым уроне, які хлусня на дзяржаўным узроўні чыніць духоўнаму і маральнаму гартаванню моладзі. Нам даюць урок хцівасці і пакоры — замест адказнасці за будучыню краіны...

Генадзь ГУРЭВІЧ,
навучэнец
Мінскага дзяржаўнага
політэхнічнага каледжа.

АД РЭДАКЦЫІ
Прозвішча аўтара зменена па вядомай усім прычыне.

РАЗОБЛАЧЕНИЕ

Алесь МИХАЛЕВИЧ, экс-кандидат в депутаты Палаты представителей по Уручскому округу №109:

"...На тех участках, где находились наиболее опытные наблюдатели, нам удалось провести отдельный подсчет голосов в предварительный период и непосредственно в день голосования. И получилась фантастическая картинка: до 70 процентов избирателей в день выборов голосовали на этих участках за меня. А вот результаты в корзине предварительного голосования были диаметрально противоположными: до 90 процентов — за кандидата от власти. Учитывая тот факт, что на некоторых участках процент предварительного голосования едва ли не превысил явку непосредственно 28 сентября, можно сделать выводы, насколько правдивые результаты мы получили в итоге".

ФОТОФАКТ

Урны вскрыли среди бела дня?

Наблюдатель от Объединенной гражданской партии Виталий Стожаров утверждает, что на участке №456 г.Минска, где баллотировался лидер ОГП Анатолий Лебедько, во время досрочного голосования была вскрыта урна. Соответствующее заявление с фотодоказательством наблюдатель подал в прокуратуру Минска, Центризбирком, а также окружную комиссию и миссию ОБСЕ.

— На протяжении досрочного голосования на участке №456 я фотографировал урну и оттиск печати, — рассказал "Народной воле" Виталий Стожаров. — И каждый день сверял эти снимки. На ночь урну обматывали веревкой — мне удалось этого добиться, чтобы быть уверенным в том, что дно урны не снимут. Все было нормально до субботы 27 сентября. В обед я ушел обедать, а когда вернулся, то заметил, что печать не совпадает с той, которая была на урне раньше. Изменения были незначительные, но явные. Я тут же запечатлел это на фотоаппарат. Ближе к 16 часам на участок приехали лидер ОГП Анатолий Лебедько, доверенное лицо Лебедько Михаил Пашкевич и международный наблюдатель ПА ОБСЕ из Эстонии Силвер Мейкар. Я поинтересовался у дежурного милиционера, отлучался ли он куда-либо во время обеденного перерыва. Он заявил, что нет. Но отвечал очень неуверенно.

Естественно, что председатель комиссии Николай Лагунович отрицает факт вскрытия урны. Но тем не менее факт налицо, или точнее — на фотографии. Я уже подал заявление в прокуратуру, а также копии заявления отправил в ЦИК, окружную комиссию и миссию ОБСЕ. Заявление подписали также Анатолий Лебедько, его доверенные лица Михаил Пашкевич и Оксана Крищанович, наблюдатель Павел Чумаков. Председатель комиссии свою подпись, естественно, ставить отказался.

Ольга ГРИНЕВИЦКАЯ.





Мертвые души

В Старовиленском округе №105 Минска, где баллотировался в депутаты лидер ОГП Анатолий Лебедько, наблюдатели зафиксировали "приписки".

Наблюдатели вели подсчет избирателей, принявших участие в голосовании. После того как они суммировали количество людей, пришедших на выборы 28 сентября, и тех, кто проголосовал досрочно, оказалось, что этот результат существенно отличается от цифр, зафиксированных в итоговых протоколах, выданных участковыми избирательными комиссиями.

Например, на участке №453 в списке для голосования значилось **1920** избирателей. По данным наблюдателей, в досрочном голосовании приняли участие **140** человек, а 28 сентября проголосовал **671** человек. В сумме получается **811** избирателей. На этом участке, как сообщил Анатолий Лебедько, наблюдение было организовано на протяжении всех дней голосования. Велся подсчет каждого проголосовавшего избирателя. А в протоколе комиссии указана цифра **1216** проголосовавших избирателей.

"Разница существенная — **405** голосов, точнее **405** мертвых душ. К тому же на данном участке более ста человек вообще не оказалось в списках для голосования. Несложная арифметика показывает, что выборы на участке №453 не состоялись. А минимальная приписка кандидату от власти составила **405** + **140** = **545** голосов из **811**", — считает кандидат в депутаты.

"На участке №484 зафиксировано **494** мертвые души, на 485-м участке — **334** , на 454-м — **470**, на 483-м участке — **440** и так далее. И такая ситуация повсеместно. Чем ниже явка избирателей, тем больше приписки", — сообщил Анатолий Лебедько.

Он намерен добиться отмены результатов голосования по своему округу.

Як працавалі на выбарах людзі Бэла

Кампанія Лорда Бэла "Бэл Поцінгер Груп", якая заключыла з беларускім кіраўніцтвам кантракт на паляпшэнне іміджу Беларусі, актыўна дапамагала замежным журналістам асвятляць парламенцкія выбары, часам гуляючы на мяжы дазволенага ў спробах дабіцца пазітыўнага асвятлення працэсу.

Напрыклад, карэспандэнт "Sunday Telegraph" Колін Фрыман у сваім рэпартажы з Беларусі ўспамінае, што ён не змог атрымаць журналісцкую візу на прэзідэнцкія выбары 2006 года, бо Міністэрства замежных спраў часам не адказвала на тэлефанаванні і марудзіла з разглядам яго заяўкі.

Сёлета было без праблем: Фрыман патэлефанаваў у офіс лорда Бэла, які хутка зрабіў акрэдытацыю і нават прапанаваў інтэрв'ю з кіраўніком Цэнтрвыбаркама Лідзіяй Ярмошынай.

Спробы англамоўнага тэлеканала "Аль-Джазіра" дамовіцца са спадарыняй Ярмошынай на інтэрв'ю не давалі выніку, пакуль журналісты зноў жа не набралі нумар офіса лорда Бэла.

Супрацоўнікі "Бэл Поцінгер Груп" працавалі ў Мінску падчас выбараў. "Спін-дактары" з Брытаніі, здаецца, не цураюцца маніпуляцый фактамі, каб "адмыць" Аляксандра Лукашэнку.

Напрыклад, у прэс-рэлізе для замежных журналістаў, што патрапіў інтэрнет-рэсурсу "Мы", кампанія сцвярджае:

"16 жніўня ўлады вызвалілі Аляксандра Казуліна. Яны гэта зрабілі без умоў, да крайняга тэрміну рэгістрацыі кандыдатаў у выбарах, прызначаных на 28 верасня, без аніякіх абмежаванняў на яго магчымасць удзельнічаць у іх".

Магчыма, гэта так, але нічога не гаворыцца пра тое, што ў Казуліна было толькі два дні, каб сабраць 1000 подпісаў ды падрыхтаваць дэкларацыю аб даходах. Апошняе было ўвогуле немагчыма, бо ён выйшаў з турмы ў суботу. Да таго ж Казулін дагэтуль не бачыў указа аб памілаванні і не ведае, ці была з яго знятая судзімасць.

Наступныя пасажы нават пацешныя:

"Сёлета Беларусь прыняла новы закон аб СМІ, які ўступіць у сілу 9 лютага 2009 года. Гэты закон спрашчае працэс акрэдытацыі СМІ, гарантуе свабоду слова, абараняе крыніцы журналістаў, спыняе цэнзуру ў СМІ і гарантуе канкурэнцыю. Фактычна ён кадыфікуе бягучую лібералізацыю беларускіх СМІ. У 2006 годзе Беларусь карала медыі 102 разы, а ў гэтым годзе -- толькі адзін раз". Карацей кажучы, "поўныя жыцця" свабодныя СМІ здольны забяспечваць дэмакратычныя правы народа Беларусі.

Ёсць таксама і параграф аб правах чалавека.

"Беларусь імкнецца да дабрабыту ўсіх грамадзян. Улады не праводзяць адрозненняў паміж правамі кожнага грамадзяніна незалежна ад полу, групы або рэлігіі. Урад жадае, каб усе беларусы дабіліся поспеху і адыгрывалі поўную ролю ў грамадстве".

Сапраўды, хацелася б жыць у такой краіне, пра якую расказалі замежным журналістам людзі Бэла.

Максім КАЛАШНІКАЎ.

СВОИМИ ГЛАЗАМИ

Так называемые

В избирательной кампании главное — арифметика. Так учил классик большевистского режима. Строго придерживается этого канона и режим, правящий ныне в Беларуси.

В качестве примера подсчета голосов приведу 52-й участок Витебского-Чкаловского избирательного округа №18.

Процедура подсчета регламентирована статьей 55 Избирательного кодекса.

Кодекс гласит: *"Перед вскрытием ящиков для голосования все неиспользованные бюллетени по выборам подсчитываются и погашаются, складываются в пакеты и опечатываются. Пакеты подписываются в присутствии членов комиссии".*

Что было на деле. Неиспользованные бюллетени до вскрытия урн в присутствии членов комиссии 52-го участка не подсчитывались и не погашались. Подсчитывала их секретарь комиссии, но уже после вскрытия урн с бюллетенями. О погашении бюллетеней членам комиссии вообще ничего не сообщили.

Кодекс гласит: *"Подсчет голосов осуществляется поочередно: досрочное голосование, в переносных ящиках, голосование на участке".*

Что было на деле. Подсчет голосов велся тайно. Председатель комиссии 52-го участка Нина Шубина пресекала малейшую попытку членов комиссии озвучить результат счета. Результаты писались на бумажке.

Бюллетени и бумажки с результатами потом переносили на отдельный стол, на котором председатель комиссии и делала окончательные подсчеты. Их она не оглашала.

Единственное, что озвучивалось, так это то, в какую стопку за какого кандидата складываются бюллетени. Стопки, впрочем, пересчитать не позволили. Количество бюллетеней в каждой стопке члены комиссии считали молча.

У меня сложилось впечатление, что председатель комиссии Шубина и секретарь Орлова подгоняли результат под заранее установленные цифры. Откуда такое впечатление? Объясняю.

Вдруг начался какой-то "шухер", и бюллетени начали пересчитывать. Наконец нашелся один бюллетень кандидата власти, ошибочно попавший в другую стопку. После его перемещения на нужное место все успокоились, все сошлось. Откуда они заранее знали, что в бюллетенях кандидата власти "непорядок"?..

Кодекс гласит: "*Участковая комиссия устанавливает:*

— общее число избирателей;

— число избирателей, принявших участие в голосовании;

— число голосов, поданных за каждого кандидата;

— число голосов, поданных против всех кандидатов;

— число бюллетеней, признанных недействительными".

Что было на деле. Ничего этого комиссия 52-го участка не устанавливала. Причины, по которым бюллетени признаны недействительными, не озвучивались. Председатель комиссии не объявила, что выборы состоялись.

Кодекс гласит: *"Результаты подсчета голосов рассматриваются на заседании участковой комиссии и заносятся в протокол. Протокол подписывается всеми членами комиссии" (ч.10 ст.55 ИК).*

Что было на деле. Результаты подсчета голосов на заседании участковой комиссии не оглашались. Члены комиссии подписали незаполненный протокол без оглашения результата голосования. Цифры в протокол вносились уже после его подписания. Наблюдателям подписать протокол даже не предлагали.

И еще — о моих личных наблюдениях.

По информации председателя комиссии 52-го участка, досрочно проголосовало 41,3 процента избирателей. Судя по куче бюллетеней на столе, действительности эта цифра соответствует. Смущает меня другое. Бюллетени, которые избиратели вбрасывали в урны в день основного голосования, выглядят совсем не так, как те, которые оказались в урне для голосования досрочного. В день выборов люди складывали свои бюллетени: кто пополам, а кто и вовсе в четверо. А вот на досрочном голосовании большая часть бюллетеней оказалась без всяких сгибов.

Странно, не правда ли?

В общем, мой вывод: о прошедших выборах можно говорить только с обязательным уточнением "так называемые"...

Валерий ЩУКИН.

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

Святлана ЛЯБЕДЗЬКА: «Вынік галасавання на ўчастку, дзе я была назіральнікам, паведамілі праз 15 хвілін пасля яго закрыцця»

Сваімі ўражаннямі ад назірання за выбарамі з карэспандэнтам "Народнай волі" дзеліцца Святлана Лябедзька.

"Роўна ў восем гадзін вечара, як і належыць, дзверы 453-га выбарчага ўчастка 105-й Старавіленскай акругі былі зачынены, — расказвае Святлана Паўлаўна. — Сябры ўчастковай камісіі, як па камандзе, ссунулі сталы і падлік галасоў распачаўся... Назіральнікам, а іх на ўчастку было разам са мной толькі двое, не дазволілі наблізіцца да стала, дзе адбываўся падлік галасоў, — нам указалі на месцы, дзе мы знаходзіліся ўвесь час пры галасаванні... Да стала, дзе адбываўся падлік, было метраў 10—15. Разам з "калегай" па назіранні мы абурыліся, адмовіўшыся сядзець на сваіх месцах, бо наўпрост хацелі бачыць, як адбываецца падлік галасоў. Але старшыня камісіі Зоя Баслык, пачуўшы нашую просьбу, у літаральным сэнсе закрыла нам агляд грудзьмі... Тым часам сябры выбарчай камісіі, абкружыўшы стол, павярнуліся да нас спінамі. Мы толькі і бачылі, што іхнія "пятыя кропкі"...

Усе нашыя спробы неяк наблізіцца да стала, дзе адбываўся падлік галасоў, выклікалі ў старшыні выбарчай камісіі прыступы крыку. У рэшце рэшт Зоя Баслык стала патрабаваць ад міліцыянера, які знаходзіўся на ўчастку, каб нас наўпрост вывелі. Але, на здзіўленне, той просьбу выконваць адмовіўся..."

Дарэчы, перад пачаткам падліку галасоў назіральнікі спрабавалі высветліць у старшыні ўчастковай камісіі, колькі ж чалавек усяго прагаласавала. "Мы ведалі дакладна колькасць людзей, унесеных у спісы. Уразіла іншае: літаральна кожны пяты выбаршчык, які галасаваў на нашым участку, не быў занесены ў асноўны спіс. Многіх запісвалі ў так званыя дадатковыя спісы. Я спрабавала высветліць, чым абумоўлена такая сітуацыя, на што старшыня камісіі паведаміла, што спісы выбаршчыкаў ім прадастаўляе ЖЭС... На гэтым тлумачэнні скончыліся... Нам не прадаставілі ніякай інфармацыі наконт таго, колькі людзей прагаласавала па "дадатковых" спісах... Спадарыня Баслык паведаміла, што не абавязана дзяліцца з назіральнікамі падобнай інфармацыяй..."

Святлана Лябедзька прызнаецца, што ёй не ўдалося ўбачыць, як адбываўся падлік галасоў: "Я бачыла толькі, як змесціва урн высыпалі на стол і расклалі бюлетэні па стосах. Я бачыла, што былі дакладна падлічаны сапсаваныя бюлетэні... Ды пра што казаць, калі літаральна праз 15 хвілін пасля закрыцця ўчастка сябры выбарчай камісіі ўжо вывесілі канчатковы пратакол аб выніках галасавання".

Святлана Лябедзька сумняваецца, што лічбы, якія былі вывешаны пасля падліку галасоў, сапраўдныя. "Справа ў тым, што ў дзень галасавання я знаходзілася на ўчастку з васьмі раніцы, — гаворыць яна. — Фіксавала літаральна кожнага, хто прыходзіў на ўчастак. Разам з вынікам датэрміновага галасавання на ўчастку, па маіх падліках, прагаласаала 811 чалавек. А пры канчатковым "падліку" высветлілася, што на ўчастку прагаласавала ледзьве не 1200 чалавек. Я дапускаю, што мной зафіксаваны не ўсе прыйшоўшыя на ўчастак людзі, але памыліцца на 400 чалавек я не магла ніяк. Адсюль выснова — празрыстасць, адкрытасць і рэальнасць выбарчых лічбаў на ўчастку, дзе я была назіральнікам, выклікае недавер. Карацей, выбары ў Беларусі прайшлі як заўжды..."

Віталь ГАРБУЗАЎ.

СТРАШНА!

Крывавае папярэджанне Уладзіміру Базану

Толькі цудам застаўся жывым пасля нападу слынны віцебскі журналіст, рэдактар недзяржаўнай газеты "Курьер из Витебска" Уладзімір Базан.

Літаральна праз дзень пасля выхаду чарговага нумара свайго невялікага (накладам у 299 асобнікаў), пакуль яшчэ не зарэгістраванага, але ўжо вельмі папулярнага ў абласным цэнтры выдання, Уладзімір быў па-зверску збіты побач з домам, дзе жыве. Невядомы бамбіза, твар якога ў цемры быў не бачны, нанёс два моцныя ўдары па галаве сваёй ахвяры і збег.

Варта нагадаць, што на працягу 2007-га і 2008 гадоў Базан атрымаў поштай некалькі пагрозлівых лістоў ад мясцовых актывістаў "РНЕ" — "Русского национального единства" — расійскай арганізацыі нацыстаў, якая дэкларуе ідэю ўключэння Беларусі ў склад РФ і адкрыта выказвае нянавісць да ўсяго беларускага — ад суверэнітэту да мовы. Адпраўнікі лістоў называлі сябе прыхільнікамі прэзідэнта А.Лукашэнкі, які, маўляў, змагаецца супраць Захаду і яўрэяў, прагне аб'яднання з Расіяй, а такія, як Базан, шкодзяць яму і мусяць быць пакараныя. Аўтары пагроз патрабавалі ад Ул.Базана спыніць публікацыі на беларускай мове і з крытыкай улады, а калі ён не зробіць гэтага, то да яго "будут приняты самые решительные меры".

Падобныя лісты атрымалі некалькі чалавек у Віцебску, і некаторыя з іх афіцыйна паскардзіліся ў пракуратуру і КДБ, але атрымалі адказ, што арганізацыя пад назвай "РНЕ" ў Беларусі не зарэгістравана, а гэта азначае, што ў Віцебску яе прадстаўнікоў быць не можа і знайсці іх немагчыма.

Базан у праваахоўныя органы не звяртаўся, але нядаўна быў запрошаны ў КДБ, дзе яго дапрасілі, намякаючы, што лісты — справа рук мясцовай апазіцыі, якая, маўляў, сама сабе пагражае. На што журналіст дасціпна заўважыў, што яго суразмоўца наўрад ці ведае, што і каму піша калега ў суседнім кабінеце.

А праз колькі дзён нехта, прасачыўшы за распаўсюджвальнікам недзяржаўнай прэсы ў Віцебску Барысам Хамайдам, абрабаваў яго, забраўшы вялікую колькасць нумароў "Курьера из Витебска", дзе былі змешчаны матэрыялы з крытыкай мясцовых чыноўнікаў.

26 і 28 верасня Барыс Хамайда правёў на выбарчым участку, размешчаным у абласной філармоніі, дзе па ўласнай ініцыятыве вёў падлік выбаршчыкаў. Раз-пораз яго падмянялі Уладзімір Базан з жонкай Аленай, каб адпусціць на распаўсюджванне газет. А напрыканцы дня, 28 верасня, Хамайда патэлефанаваў з участка Базану і паведаміў, што ў яго ёсць цікавая інфармацыя для газеты. Уладзімір і Алена Базан рушылі ў філармонію, адкуль, пагутарыўшы з Барысам, пайшлі дадому. Алена зайшла ў кватэру першай, а Уладзімір затрымаўся ля пад'езда. Тут да яго і падскочыў невядомы, які і нанёс удары, смяротна небяспечныя для чалавека, які перанёс аперацыю на сэрцы. Хто ведае, можа, нападаючы і разлічваў на самы горшы для Уладзіміра вынік?

Сэрцам адчуўшы няладнае, Алена пайшла сустракаць мужа і, убачыўшы яго на лесвіцы пад'езда, ледзьве не страціла прытомнасць: перад ёй быў муж з параненай галавой і разбітым, скрываўленым тварам...

"Хуткая" адвезла Базана ў траўмпункт, дзе медыкі аказалі Уладзіміру першую дапамогу і выклікалі следчага з міліцыі, які, пасля апытання, узяў з пацярпелага пісьмовую адмову ад узбуджэння крымінальнай справы. Базан пайшоў на гэта, разумеючы, што нападаючага ўсё роўна не знойдуць, а калі ён з той "канторы", якая сачыла за Хамайдам, то і шукаць не будуць.

Тым не менш назаўтра, калі Уладзімір ужо знаходзіўся дома, да яго прыйшлі супрацоўнікі міліцыі і паведамілі, што следства ўсё ж будзе весціся і гэтая сустрэча з імі для Уладзіміра — не апошняя, а толькі першая.

Такім чынам, у сілавікоў з'явілася афіцыйная магчымасць адкрыта сачыць за "нязручным" журналістам, трымаць яго "пад каўпаком".

Уладзімір Сяргеевіч не ведае і нават не хоча здагадвацца, хто зрабіў замах на ягонае жыццё. У адным ён упэўнены: гэта быў не выпадковы хуліган альбо здурнелы ад п'янства бадзяга.

Што ж, не будзем рабіць высновы і мы. Але ёсць тут над чым падумаць, ці не праўда?

Сяргей БУТКЕВІЧ.

Народная Воля http://www.nv-online.info
2 КАСТРЫЧНІКА 2008 г.

ЧУЛІ?

Сяргея Сідорскага пусцяць у Лондан

Прэм'ер-міністр Сяргей Сідорскі ўзначаліць дэлегацыю Беларусі на першым Беларускім інвестыцыйным форуме 18 лістапада ў Лондане, паведамляе МЗС Беларусі. Удзел у форуме возьмуць кіраўнікі міністэрстваў, ведамстваў, галіновых канцэрнаў, прадпрымальніцкіх саюзаў, вядучых прадпрыемстваў, зазначае прэс-служба знешнепалітычнага ведамства.

Паводле інфармацыі кампаніі "Эвентыка", што з'яўляецца арганізатарам мерапрыемства з брытанскага боку, у склад беларускай дэлегацыі таксама ўвойдуць намеснік прэм'ер-міністра **Андрэй Кабякоў**, міністр фінансаў **Андрэй Харкавец**, намеснік старшыні праўлення Нацыянальнага банка **Віктар Мацюшэўскі**.

Апрача таго, удзел у працы форуму возьме прэзідэнт Еўрапейскага банка рэканструкцыі і развіцця **Томас Міраў**, генеральны сакратар Канферэнцыі ААН па гандлі і развіцці (ЮНКТАД) **Панічпакдзі Супачаі**, брытанскі эканаміст лорд **Роберт Скідэльскі**.

"Беларускі інвестыцыйны форум з'яўляецца унікальнай магчымасцю для вядучых прадстаўнікоў інвестыцыйных і дзелавых колаў для знаёмства з ключавымі фігурамі ўрада і бізнесменамі з Беларусі", — зазначана ў паведамленні. Нагадаем, што шэрагу беларускіх чыноўнікаў уезд у краіны Еўропы і ЗША забаронены, але кіраўнік беларускага ўрада не ўваходзіць у гэты спіс. У любым выпадку, мерапрыемства, якое ладзіцца, у Англіі можна лічыць незвычайным: шмат гадоў дзверы еўрапейскіх краін былі проста зачынены для ўсіх беларускіх прапаноў.

Дзярждэпартамент ЗША заблакіраваў шэраг праектаў у Беларусі

Шэраг высокатэхналагічных праектаў з удзелам амерыканскіх кампаній у Беларусі быў заблакіраваны дзярждэпартаментам ЗША. На гэтым тыдні такую інфармацыю пацвердзіў прадстаўнік вядомага ў свеце камп'ютэрнага вытворцы і навукова-тэхнічнага распрацоўшчыка Hewlett-Packard, рэгіянальны дырэктар гэтай карпарацыі ў Беларусі.

Паводле слоў рэгіянальнага дырэктара беларускага даччынага прадпрыемства кампаніі Hewlett-Packard ЗААТ "Х'юлет-Пакард Бел" Канстанціна Лявонава, амерыканскі вытворца ўвесну адклікаў свае прапановы з тэндэру па разгортванні інфармацыйнай інфраструктуры канцэрна "Белнафтахім", праект якога рыхтаваўся доўгія месяцы. Гэта здарылася з-за таго, што кампанію Hewlett-Packard амерыканскія органы экспартнага кантролю папярэдзілі аб немагчымасці паставак высокатэхналагічнай апаратуры для "Белнафтахіма".

На пытанне, ці купляў "Белнафтахім" пасля гэтага выпадку абсталяванне Hewlett-Packard ці стаў шукаць магчымасці набыцця высокапрадукцыйнай інфармацыйнай тэхнікі ў еўрапейскіх вытворцаў, Канстанцін Лявонаў адказаў:

— На такое пытанне вымушаны сказаць, што не ведаю.

Паводле інфармацыі з іншых крыніц, "Белнафтахім" вёў перамовы аб стратэгічным партнёрстве з адным з канкурыруючых з НР вытворцаў з Еўрасаюза, у якога, аднак, кошты нашмат вышэйшыя.

Канстанцін Лявонаў працуе ў Hewlett-Packard шмат гадоў, да ліпеня 2008 года ён займаў у маскоўскім офісе пост дарадцы генеральнага дырэктара НР у краінах СНД, таму добра разбіраецца ў сітуацыі і метадах каардынавання працы з ЗША.

— Мы — амерыканская кампанія. Таму з ЗША перыядычна прыходзяць дырэктывы, дзе названыя прадпрыемствы і арганізацыі, куды нельга паставіць нашу прадукцыю. Мы нічога з гэтым не можам зрабіць. Апошні раз у такім лісце значыліся 10 беларускіх кампаній, — сказаў Канстанцін Лявонаў, паведамляе Хартыя-97.

НУ И НУ!

Съедали продукты, не доходя до кассы

Недюжинный аппетит гродненцев удивил сотрудников гипермаркета "Алми". В день открытия магазина администрация была вынуждена объявлять через информационный центр, что есть продукты, не расплатившись, нельзя.

"Несмотря на то, что в торговых залах работает современная система видеонаблюдения, посетители съели внушительное количество продуктов, так и не дойдя до кассы", — рассказал "Вечернему Гродно" руководитель департамента маркетинга сети "Алми" Сергей Каранкевич. Кроме этого, группы молодых людей умудрялись выносить мелкие, но дорогостоящие вещи. Например, станки для бритья. Каков ущерб, подсчитают после инвентаризации. В первые дни после открытия "Алми" посещало по 50 тысяч человек в день. Из них 10—11 тысяч становились покупателями.

ТЕМА

Подоплека «молочной войны»

Торговые войны между Россией и Беларусью вспыхивают в общем-то регулярно. Чаще всего они скрыты от глаз, но иногда все же становятся достоянием широкой общественности. В незапамятные времена гремели "водочные" войны, в прошлом году была пресловутая "сахарная", ну а в году нынешнем "бои неместного значения" идут уже вокруг торговли сухим (порошковым) молоком.

Начало

По большому счету белорусско-российская "молочная война" началась в первые месяцы нынешнего года. С начала января Россия заметно увеличила импорт сухого молока — и, прежде всего, из Беларуси. Местные производители молочных продуктов предпочитали белорусское сухое молоко свежему российскому. Как результат закупочная цена на натуральное молоко у российских производителей упала на полтора рубля. На ситуацию лично обратил внимание тогдашний российский премьер Виктор Зубков.

Действительно, демпинг был налицо: если еще летом 2007-го на российские пищевые заводы порошковое сухое молоко приходило по цене 140 руб/кг, то к началу 2008 года цена уже была снижена до 90 руб/кг. С учетом того, что из 1 кг порошка производится около 7 литров молока, молокозаводы стали активнее закупать именно белорусский порошок, а не натуральное молоко у российских производителей.

Замечу: в Беларуси повышение закупочных цен на молоко в 2007 году происходило дважды — в январе (на 5%) и в сентябре (тоже на 5%). В рознице молоко тогда подорожало на 2% (в сентябре). Тот год был вообще странным: в соседних с Беларусью странах цена на молоко и продукты из него за год увеличилась на 30—210%. В результате значительная часть белорусского молока пошла на экспорт. Министерские чиновники тихо радовались: именно продажа белорусскими молокоперерабатывающими предприятиями своей продукции на экспорт позволяла им быть рентабельными (0,5—6%). В противном случае повышение закупочных цен вынудило бы отечественных переработчиков работать с убытками. Либо значительно повышать отпускные цены для потребителей внутри Беларуси.

Для справки.

Объем российского рынка сухого молока составляет 250 тысяч тонн в год, из них 60.000 приходится на импорт. Где-то 45-50 тысяч тонн поставляет Беларусь. На долю порошкового молока приходится 13% от всего объема потребляемого в России молочного сырья.

Российские правительственные эксперты определили: при запрете на поставки импортного сухого молока цена сырого молока в России превысила бы 15—17 рублей за литр. А это вернуло бы производителям молока утраченную рентабельность. Однако просто так закрыть российский рынок для белорусской молочной продукции россияне не могут. Во-первых, вроде бы единое Союзное государство. Во-вторых, между Беларусью и Россией по поводу молока существует соглашение, которое предполагает снижение объемов поставок сухого молока к 2012 году только на 10%.

Особенности русского национального молока

В июне нынешнего года российский президент Дмитрий Медведев подписал так называемый "Технический регламент на молоко и молочную продукцию" — теперь это федеральный закон. Документ определил нормативы для производителей и понятия для покупателей. То есть пакет молока может называться "молоком", если в нем натуральный цельный продукт — "из-под коровы". А все, что сделано на основе или с добавлением порошкового молока, производители должны называть иначе — к примеру, "молочным напитком".

Российская молочная промышленность, можно сказать, содрогнулась. И было из-за чего. Дело в том, что в РФ (как, впрочем, и в Беларуси) сельхозпредприятиями производится низкокачественное молоко — по показателям жирности, белка и ряду других оно не соответствуют принятым стандартам. Так что для его нормализации (чтобы снизить жирность и увеличить количество белка) переработчикам приходится добавлять сухое обезжиренное молоко.

Для розничной же торговли молоко, полностью соответствующее требованиям техрегламента, в России выпускают лишь несколько компаний. Теперь, видимо, таковых станет больше. Цены вырастут, но при этом понятно, что большинство россиян все равно предпочтет нормальное молоко некоему "молочному напитку". А вот потребность в сухом молоке, включая белорусское, наверняка упадет. Но, как считают эксперты, ненамного — ведь реально заменить его нечем.

Осень. Новые бои

Недавно "Интерфакс" сообщил, что "Беларусь по инициативе России ужесточит ветеринарный контроль в отношении своей продовольственной продукции и позволит российским специалистам чаще проверять мясомолочные предприятия". Тогда замминистра сельского хозяйства и продовольствия Беларуси Михаил Савельев признался: "Российская сторона определила некоторые недостатки государственного ветеринарного контроля в Беларуси, которые нужно устранить, чтобы поставлять белорусское продовольствие в Россию. Речь идет о ряде системных, организационных и хозяйственных вопросов".

В переводе с бюрократического новояза это означает сразу несколько вещей. Первое: россияне устали терпеть слишком низкое качество белорусского молочного сырья. Второе (отнюдь не отменяющее первое): россияне решили "попридержать" чересчур активно демпингующих белорусов, чтобы за счет роста цен на молоко внутри России вывести собственных производителей хотя бы на уровень самоокупаемости.

Паводле яго інфармацыі, у сярэднім кожны мінчанін штогод да 12 разоў наведвае ўстановы аховы здароўя (паліклінікі, дыспансеры, "хуткая дапамога"). *"На 100 тыс. насельніцтва прыпадае 101 тыс. выпадкаў першаснага захворвання. Гэта значыць у сярэднім кожны мінчанін хварэе 1 раз у год",* — зазначыў Д.Піневіч.

Сукупнасць усіх захворванняў складае ў Мінску больш за 170 тыс. фактаў на 100 тыс. насельніцтва, ці 1,7 хваробы на кожнага чалавека. Штогод кожны пяты мінчанін шпіталізуецца. Гэта высокі паказчык, лічыць спецыяліст, таму прыярытэтнай задачай з'яўляецца правядзенне комплексу мерапрыемстваў па зніжэнні ўзроўню захворванняў.

Наталля КАРОТКАЯ.

Народная Воля http://www.nv-online.info
2 КАСТРЫЧНІКА 2008 г.

ВЫСТАВЫ

Казачная вандроўка ў дарунак

Яго зрабіў вядомы мастак Мікола Купава разам са сваімі вучнямі: з іх клопату і творчасці ў Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры разгорнута выстава мастацкіх твораў, якія ўвасабляюць чароўныя казкі беларускай зямлі.

У шматграннай дзейнасці Міколы Купавы кніжнае мастацтва займае значнае месца. Ён аздобіў каля трох дзесяткаў кніг беларускіх аўтараў. Многія кнігі з яго ілюстрацыямі атрымалі дыпломы рэспубліканскіх і занальных конкурсаў. За афармленне энцыклапедычнага даведніка "Францыск Скарына" М.Купава ўдастоены дыплома і медаля Ф.Скарыны ў 1988 годзе.

Беларуская народная казка — улюбёная тэма мастака. На гэтай выставе М.Купава паказаў тры кнігі: "Хведар Набілкін і сапраўдныя асілкі", "Сіняя Світа Налева Пашыта", "Прыгоды хлопчыка Лучынкі" аўтаркі Яніны Керуль. Майстар прывівае любоў да гэтага жанру і сваім вучням.

Мастак гаворыць: "Беларуская казка вызначаецца асаблівым багаццем зместу і вобразнасці. Тут ёсць усё: фантастычны свет, чалавечыя моц і слабасць, геройства і здрада, прыгожыя людзі, гарады, рэкі і моры...

Гэта ў канцэнтраваным выглядзе — наша нацыянальная культура".

Выстава паказвае ілюстрацыі да народных казак, і кожны наведвальнік можа ўвайсці ў цудоўны і загадкавы, прыгожы і фантастычны свет. Свет, убачаны вачыма дапытлівых і таленавітых мастакоў. Побач з творамі вядомага майстра — работы яго адораных вучняў Віктара Карзуна, Ганны Арэф'евай, Іры Купавы, Рагнеды Купавы, Таццяны Загараўскай, Ганны Раманоўскай, Вольгі Раманюк, Настассі Яравой.

Вольга ГУСЕВА,
супрацоўніца Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры.

РЭГІЁН

Унікальны праект

У вёсцы Лучай Пастаўскага раёна Віцебскай вобласці пачалі ствараць унікальнае Евангелле, якое складаецца з барэльефных ікон.

Як паведамілі БелаПАН у касцёле святога Юды Тадэвуша ў вёсцы Лучай, першыя дзве фігуры — святых апосталаў, братоў-рыбакоў Пятра і Андрэя — ужо ўстаноўлены і былі асвечаны напярэдадні, 28 верасня. Плануецца, што надалей мясцовы касцёл упрыгожаць 65 барэльефных ікон, у тым ліку выявы ўсіх 12 апосталаў Ісуса Хрыста.

Як паведамляў БелаПАН, на тэрыторыі Лучайскага касцёла, які з'яўляецца помнікам культуры XVIII стагоддзя, 15 чэрвеня гэтага года быў устаноўлены і асвечаны трохметровы помнік Папу Рымскаму Бенедзікту XVI. Гэта першы ў свеце манумент у гонар дзейнага кіраўніка каталіцкай царквы.

Таццяна ЧАБАТАРОВА.

ШОУ-БИЗНЕС

Кто поедет на "Евровидение-2009"?

Прием заявок для участия в Национальном телевизионном музыкальном проекте "ЕвроФэст" начнется 5 октября. Об этом БЕЛТА сообщила исполнительный продюсер музыкальной дирекции Белтелерадиокомпании и проекта "ЕвроФэст" Анастасия Тиханович.

До 20 ноября заявки на участие в конкурсе, который является отборочным этапом международного конкурса песни "Евровидение", могут подать граждане Беларуси.

Имена 15 полуфиналистов, которые продолжат бороться за право представить Беларусь на международном конкурсе "Евровидение-2009" в Москве, станут известны в начале декабря. Имя белорусского участника на песенном конкурсе станет известно в январе 2009 года.

СВЕТСКАЯ ЖИЗНЬ

Игорь МАКАР:

«Передайте родственникам, друзьям и знакомым, чтобы они обязательно посетили Несвижский замок...»

В конце минувшей недели состоялось торжественное открытие первого пускового комплекса Национального историко-культурного музея-заповедника "Несвиж". Людей на церемонии открытия было совсем немного: учащиеся местного колледжа, которые изучают туристическое дело, сотрудники Академии наук, руководители некоторых белорусских музеев, представители польского посольства, туристы.

На официальное открытие не поленились приехать председатель Несвижского райисполкома Игорь Макар, первый заместитель Минского облисполкома Виктор Щетько, замминистра культуры Виктор Кураш.

Некоторых неприятно удивило, что не было на данном мероприятии министра культуры Владимира Матвейчука, которому А.Лукашенко не то в шутку, не то всерьез приказал поселиться в Несвижском замке (говорили, что якобы в этот день он находился в Казахстане на встрече со своими коллегами из соседних стран).

Для всех присутствующих была организована экскурсия по замку, после которой избранные гости получили приглашение на банкет.

АВТОРИТЕТНО

Сергей ДРУЩИЦ: «Ощущается недостаток рабочей силы»

Научный руководитель реставрации Несвижского замка, директор СП "Реноватум" Сергей Друщиц говорит, что сегодня самая большая проблема — "недостаточное количество профессиональной рабочей силы".

"На объекте уже работает третий генподрядчик, — *напомнил "Народной воле" Сергей Александрович.* — Хотя рабочие Солигорского треста №3 — самые лучшие из всех, что здесь работали (это отмечают многие). И тем не менее здесь все равно ощущается недостаток рабочей силы".

На вопрос "Как вы оцениваете качество восстановительных работ?" Сергей Друщиц ответил философски: "Как наша жизнь... Где-то очень удачно, где-то очень хорошо, а где-то неважно..."

ЧТО ГОВОРИЛИ

Валерий СТОЛЯРЧУК, директор музея-заповедника "Несвиж":

— Мы открыли не только стационарную музейную экспозицию, но и новую страницу в жизни этого старого архитектурного памятника. Все это — результат работы большого коллектива специалистов. Впереди у нас много работы. Надеюсь, мы сдадим этот объект в мае 2010 года...

Виктор КУРАШ, замминистра культуры:

— В нашей республике проводится большая работа по охране историко-культурного наследия. Сегодня в Беларуси насчитывается более 4,5 тысячи памятников, из них 1590 — памятники архитектуры. И скажем прямо, что даже в советские времена, когда страна была больше, на территории этого замка 110 лет проводились только текущие работы. Новый импульс реставрации, конечно же, придало распоряжение главы нашего государства...

После того как здесь завершатся все работы, мы будем иметь огромный красивый дворец с экспозициями, современными залами, где будут проходить костюмированные балы, концерты камерной музыки, симфонические концерты, где туристам будет предложена и сеть ресторанов, чтобы можно было отдохнуть.

Игорь МАКАР, председатель Несвижского райисполкома:

— Только за 9 месяцев этого года наш город посетило более 67 тысяч туристов. С сентября в стенах Несвижского замка уже побывало почти 2,5 тысячи туристов. Думаю, сейчас количество туристов увеличится. Это ведь очень интересно — посмотреть, как жили наши предки. Передайте родственникам, друзьям и знакомым, чтобы они обязательно посетили Несвижский замок...

ТЕМ ВРЕМЕНЕМ

Галина КОНДРАТЬЕВА: «Главное, чтобы замок не стал бутафорией»

Заместитель директора Национального историко-культурного музея-заповедника "Несвиж" Галина Кондратьева уже не в первый раз говорит о том, что в замке "катастрофически не хватает аутентичных музейных предметов".

— Мы сегодня рады любой поддержке и со стороны Польши, и со стороны Литвы, — *сказала Галина Михайловна на пресс-конференции.* — Главное, чтобы замок не стал бутафорией, чтобы был настоящим... Нам нужны средства для закупки антикварных предметов, нам нужно вернуть в замок те предметы, из коллекции Радзивиллов, которые находятся в других белорусских музеях, — это и портреты, это и наши зеркала, это и книги, и многие другие вещи.

ИСТОРИЧЕСКАЯ СПРАВКА

Несвижский дворцово-парковый ансамбль — один из интереснейших памятников Беларуси. Инициатива возведения каменного замка принадлежит первому несвижскому ординату Николаю Криштофу Радзивиллу Сиротке (1549—1616). Начало строительства относится к 1582 году. С 1586-го по 1599 год руководителем работ по возведению замка был итальянский архитектор Джовани Мария Бернордони. Историко-архивные исследования дают основания говорить о французском влиянии при проектировании замка.

Замок выдержал осады русских войск в 1654-м и 1659 годах, но в 1706 году был взят шведами, которые разрушили его бастионные укрепления. Во второй половине XVIII — первой половине XIX веков его неоднократно осаждали русские войска.

Ремонтные, строительные и реконструкционные работы, начатые в 20-е годы XVIII века, ознаменовали собой новый период в жизни комплекса. Он связан с деятельностью Михаила Казимира Радзивилла Рыбоньки (1702—1762), а также его сына Кароля Станислава Радзивилла Пане Коханку (1734—1790). Восстановительными работами проекта часовни, которая разместилась в здании северной стороны дворца (построена в 1740) и театрального зала (1748) в одном из помещений комплекса руководил архитектор Казимир Жданович. Архитектор А.Лоцци создал в 1768 году проект галереи. Специально к приезду короля Станислава Августа Понятовского (1784) по проекту Л.Лютницкого оборудовали "королевский зал" (рядом с часовней). В это время интерьер восстанавливался во многих помещениях замка. В результате к 80-м годам изменился не только внутренний, но и внешний вид комплекса в целом. Все постройки были увеличены на такое количество ярусов, которое доводило их до одной высоты.

Во время Рыбоньки и Пане Коханку несвижский замок находился на пике своего расцвета. Здесь хранился архив Великого княжества Литовского. Замковая библиотека, основанная Сироткой, к началу 1770 года насчитывала около 20.000 томов книг. Во второй половине XVIII века это была самая крупная частная библиотека на земле Речи Посполитой. В картинной галерее в 1770 году находилось 984 картины. Уникальными были коллекции оружия, нумизматики, многочисленные ценности нескольких замковых сокровищниц и др.

После событий 1812 года замок находился в запустении до 1875 года. Масштабные реставрационные работы тут начали проводиться только в последней четверти XIX — начала XX века под руководством Марии Дороты де Кастелян Радзивилл. До 1913 года было полностью восстановлено около 100 помещений (всех около 170).

После 1812 года, когда генерал Витгенштейн продал замок военному ведомству, тут размещался кадетский корпус. В годы Первой мировой войны — лазарет. В 30-е годы XX века князь Альбрехт Радзивилл отдал правое крыло замка под учительскую семинарию.

Позже архитектура замка еще больше терпела от приспособления его то под военный немецкий госпиталь в годы Великой Отечественной войны (1941—1945 гг.), то под санаторий 4-го Лечсануправления (с 1945 г.) и, в конце концов, с 1991 года под санаторий "Белмежколхозздравницы".

Под охрану замок был взять в 1939 году. Однако на протяжении последних 110 лет проводились только текущие ремонты.

В 2005 году архитектурно-культурный комплекс резиденции рода Радзивиллов в Несвиже включен в Список всемирного наследия ЮНЕСКО.

Марина КОКТЫШ.

УРАЖАННІ

Экскурсія з чорнага ўваходу

За тыдзень да афіцыйнага адкрыцця першай адрэстаўрыраванай часткі палаца Радзівілаў у Нясвіжы пабывала наш карэспандэнт.

Ідучы па ліпавай алеі, якая вядзе да Нясвіжскага палаца, узгадваю археалагічны фэст 2004 года. Тады па гэтай самай алеі паволі рухаўся вялізны натоўп, ствараючы сапраўдныя людскія заторы. У пазамінулую нядзелю на Нясвіж апусцілася шчыльная паласа дажджу, але рух на алеі не супыняўся. Людзі ішлі пабачыць палац Радзівілаў адноўленым. Тады, у 2004-м, сумны выгляд палаца выклікаў мары аб яго аднаўленні. Сённяшні выгляд будынка навявае сум, што веліч і багацце аднаго з найславуцейшых родаў нашай краіны будуць страчаны назаўсёды...

Пакуль пры падыходзе да палаца я марудзіла з фотаапаратам, мае сябры трапілі ў "палон". Хлапчукі, на выгляд гадоў 10—12, апранутыя ў джынсы і спартыўныя куртачкі, рашуча распавядалі цікавосткі, звязаныя з гісторыяй палаца. Кожны з іх меў невялічкі пластыкавы пакунак, перавешаны праз руль ровара. Убачыўшы зацікаўленасць на тварах слухачоў, яны, не марудзячы, выцягнулі адтуль чорныя тэчкі з укладзенымі ў празрыстыя файлы старонкамі з падручнікаў, газет і часопісаў. Іх невялічкія архівы ўтрымлівалі выявы Радзівілаў, што некалі жылі ў палацы, апісанні легендаў, звязаных з жыццём тутэйшых гаспадароў, ды шмат іншых цікавых рэчаў. Спяшаючыся, быццам баючыся, што слухачы неўзабаве разыдуцца, хлопцы наперабой распавядалі гісторыі, якія паспелі прачытаць. Прыемна, што дзеткі зарабляюць, добра папрацаваўшы з гістарычнай літаратурай. І прыемна ўдвая, калі яны самі да гэтага прыйшлі...

Адразу на ўваходзе ў адноўлены палац нас перахапіў мужчына гадоў пяцідзесяці.

Дзядзька Міхась працуе ў Нясвіжскім палацы вартаўніком. Каб трошкі зарабіць, ён таксама падпільноўвае турыстаў і яшчэ ніводнага разу не памыліўся, выбіраючы тых, хто не пабаіцца рызыкнуць і зайсці ў старыя пакоі палаца "со двора". Падбадзёраныя тым, што зараз убачым тое, што не паказваюць звычайным турыстам, рушым за дзядзькам Міхасём. "Зараз вам такое пакажу! — абяцае наш гід. — Толькі дзеля гэтага трэба будзе трошкі па брудзе прайсціся".

Абышоўшы палац вакол, праходзім у вароты, па-за якімі туляцца адна да адной будкі вартаўнікоў, стаіць будаўнічая тэхніка. "Во гэта будынак, дзе Радзівілы коней трымалі", — пачалася "экскурсія". "Стайня, дзядзька Міхась?" — падказваем мы. "Ага, яна самая", — папыхваючы таннай цыгарэтай, пагаджаецца наш гід. Ступаючы па размытай зямлі, падыходзім да драўляных дзвярэй. Пакладзеныя на падмурак, яны выконвалі для нас ролю прыступак. Патрапіўшы ўнутр, мы ўжо адчувалі сябе героямі містычнай аповесці, якім зараз адкрыецца нейкая незвычайная таямніца. "Зараз сапраўдную красату ўвідзіце", — кліча на трасянцы дзядзька Міхась. Асцярожна ступаючы па скрыпучых дошках, трапляем у пакой з прыгожым камінам, выкладзеным кафляй цёмнага колеру. Нічым не прыкрыты, ён апынуўся пад таўсценным слоем будаўнічага пылу. У наступным пакоі мы ўбачылі шыкоўную печ з прыгожымі дзверцамі, таксама абкладзеную кафляй. "А вось тут малельня была", — працягвае экскурсію дзядзька Міхась, спыняючыся ў невялічкім пакойчыку. "Толькі да вокнаў блізка не падыходзьце, — папярэджвае ён. — А то хто ўбачыць..." Праводзячы нас пакоямі палаца, вартаўнік распавядае розныя гісторыі: "Во ўчора зноў косткі чалавека тых часоў, умураванага ў сцяну, знайшлі. Што з імі зрабілі, не знаю. Шмат тут чаго раней будаўнікі знаходзілі. Адзін нават знойдзеныя рэчы, спадзеючыся на ўзнагароду, у музей здаў. Рэчы забралі і нічога не далі. З таго часу ніхто нічога не знаходзіць..."

Доўга блукалі мы па палацу, пакуль завіталі ў вялізную залу з драўлянай столлю і трыма вялікімі камінамі, на сярэднім з якіх размешчаны радзівілаўскі герб. Кафля, якой абкладзены каміны, пачала абвальвацца. "Хочаш сабе ў якасці сувеніра ўзяць?" — падыходзячы да мяне, ціха запытаў дзядзька Міхась. А колькі яшчэ турыстаў ён правёў гэтымі заламі, прапаноўваючы рэдкія "сувеніры"?.. У зале з чатырма калонамі мы затрымаліся. З адной калоны адляцела пакрыццё, з-пад якога тырчэла сухая салома. Атынкоўка не трымалася на голых слупах, таму іх абкручвалі сухой саломай. Паветра пад пакрыццё не трапляла, таму салома захавалася да нашых дзён. Унікальная тэхналогія. "Глядзіце, бо праз некалькі тыдняў нічога з гэтага не застанецца, — запальваючы чарговую цыгарэту, кажа дзядзька Міхась. — Не магу не паліць у гэтым палацы. Нервы..."

Дзядзька Міхась прапанаваў тым, хто не баіцца, залезці па драбінах на самую высокую вежу палаца. У залежнасці ад таго, наколькі высока мы падымаліся, надпісы на сценах рабіліся больш разнастайнымі: "Тут был Вася", "Город the best — это Брест", "Миша, Коля, Слава, Сергей". "Будаўнікі панапісвалі", — тлумачыць наш экскурсавод. З круглых акенцаў вежы адкрываецца панарама на палац, на яго адноўленыя і некранутыя часткі.

Гадзіны паўтары знаходзіліся мы на забароненай тэрыторыі. Але ўсё ж такі вырашылі паглядзець на экспазіцыю музея ў адноўленым палацы. З-за дзвярэй, дзе знаходзіцца каса, пачуўся раздражнёны юнацкі голас: "Я патрабую, каб мне вярнулі грошы, бо глядзець у музеі няма чаго!" Убачыўшы новых наведвальнікаў, музейны супрацоўнік зрабіў намаганне супакоіць незадаволенага кліента. Праз некалькі хвілін я зразумела, чаму юнак хацеў вярнуць тры тысячы, патрачаныя на квіток.

Каб патрапіць у музей, трэба прайсці праз новыя пластыкавыя дзверы. Экспазіцыя размясціла-ся ў новых вітрынах пад бліскучым шклом. Пакой, дзе была радзівілаўская бібліятэка, застаўлены шафамі з шкляными дзверцамі, праз якія праглядваюцца тоўстыя кнігі. У канцы залы стаіць вялікі глобус. Наглядальнікі з гонарам кажуць, што ён захаваўся яшчэ з XVI стагоддзя. Яго толькі трошкі "адрэстаўрыравалі". Добра, што папярэдзілі, а то незразумела было, як яму праз столькі стагоддзяў удалося захаваць такі добры выгляд... У пакоі, дзе вывешаны фотаздымкі са старымі інтэр'ерамі палаца, мы пазналі пакой з трыма вялікімі камінамі. На жаль, такім, як на фотаздымку, ён ужо ніколі не стане.

Сумна было пакідаць Нясвіжскі палац. На мой погляд, не паедзе сюды ні свядомы беларускі турыст, ні замежны. Ва ўсім свеце зараз цэняць аўтэнтыку, а так званы "еўрарамонт" робіцца ў кожнай трэцяй кватэры. Да 2010 года (менавіта тады скончыцца рэстаўрацыя палаца) мы страцім яшчэ адзін унікальны помнік краіны замкаў і палацаў. А пакуль дзядзька Міхась будзе зарабляць на гарэлку, водзячы экскурсіі па яшчэ не адрамантаваных залах палаца.

Алена СЕРГІЕВІЧ.

ВІНШУЕМ!

Уладзімір Ліпскі атрымаў прэмію імя Аляксандра Грына

Літаратурная расійская прэмія імя Аляксандра Грына ўпершыню прысуджана беларускаму пісьменніку — Уладзіміру Ліпскаму.

Прэмія заснавана Саюзам пісьменнікаў Расіі, урадам Кіраўскай вобласці, дзе нарадзіўся і правёў дзіцячыя гады Аляксандр Грын, "за адпаведнасць твораў аўтара творчасці заснавальніка прэміі, за пазіцыю пісьменніка ў дачыненні да дзяцей і дзіцячай літаратуры. Беларускі пісьменнік атрымаў гэтую ўзнагароду за дзве дакументальныя аповесці: "Мама. Малітва сына" і "Бацька. Пісьмы на неба". "Гэтыя аповесці напісаныя з душою, мне здаецца, іх прадыктавалі з нябёсаў самі мае бацькі — людзі непісьменныя, святыя, — адзначыў У.Ліпскі. — Я вельмі даражу гэтымі аповесцямі і адчуваю, што яны прыйшліся вельмі даспадобы маім чытачам".

Паводле слоў лаўрэата, у дыпломе таксама адзначана яго шматгадовая праца ў дзіцячай літаратуры і дзіцячай арганізацыі. Так, У.Ліпскі 30 гадоў узначальвае часопіс "Вясёлка" і 20 гадоў кіруе Беларускім дзіцячым фондам.

"Самае прыемнае ва ўсіх узнагародах — гэта нечаканасць. Тут атрымалася сапраўды нечаканая і прыемная навіна. Я да гэтай пары не магу паверыць, што атрымаў прэмію любімага пісьменніка Аляксандра Грына, бацька якога, дарэчы, ураджэнец Беларусі", — сказаў У.Ліпскі.

Літаратурная прэмія Аляксандра Грына існуе з 2000 года. Гэтай узнагародай ужо адзначана творчасць вядомых рускіх аўтараў Альберта Ліханава, Уладзіслава Крапівіна, Ірыны Такмакавай, Валерыя Ганічава, Вільяма Казлова, Кіра Булычова, Уладзіслава Бахрэўскага, Валерыя Васкабойнікава.

Анастасія ЯНУШЭЎСКАЯ.

СПАДЧЫНА

Не састарэла «Матчына душа»

Зусім па-сучаснаму прагучалі вершы Уладзіміра Караткевіча, песні на ягоныя тэксты і ўспаміны пра славутага паэта-земляка на вечарыне ў віцебскай бібліятэцы, што носіць імя выбітнага беларуса. Урачыстасць вянчала тыдзень бібліятэк і была прысвечана 50-годдзю з часу выхаду ў свет першага зборніка вершаў Караткевіча — кнігі "Матчына душа".

З хваляваннем пабачылі прысутныя гэтае рарытэтнае выданне 1958 года, якое захаваў і падарыў бібліятэцы сябра Уладзіміра Сямёнавіча — паэт Давід Сімановіч, які ведаў Караткевіча ў маладыя гады, калі абодва працавалі настаўнікамі.

Сяргей БУТКЕВІЧ.

ПОСТАЦІ

«Між Мнютай і Аутай»

Мастак заўсёды мастак, нават калі дапамагае жонцы на лецішчы палоць моркву ці паліваць кветкі. Не раз пакланіўшыся зямлі ў чаканні будучых пладоў, можна самому "вырасціць" будучы шыкоўны нацюрморт ці букет раскошных півоняў, якія ўжо ніколі не завянуць, перанесеныя на палатно. А што казаць пра маляўнічыя краявіды наваколля, якія самі просяцца быць увасобленымі пэндзлем мастака!



Так напоўнена, клопатна і натхнёна праводзіць зазвычай летні адпачынак знаны мастак Аляксей Марачкін. Ягонае лецішча — на Віцебшчыне, у найпрыгажэйшым кутку Беларусі, дзе калісьці хадзіў ад вёскі да вёскі і пакідаў свой адметны след у мастацтве Вечны вандроўнік Язэп Драздовіч.

У вянок вялікаму творцу Аляксей Марачкін (Алесь Мага) уплятае сваю кветку — выставу жывапісных палотнаў, напісаных мінулым летам у драздовічаўскіх мясцінах. Мяккія лірычныя фарбы, паэтычнасць і пяшчота гэтых пейзажаў кранаюць вока і душу, неадольна вабяць да сябе...

Але дадзім лепш слова самому мастаку, які да таго ж піша вершы:

"Горад... Жалезабетонныя канструкцыі, шалёны рытм сённяшняга мегаполіса не можа замяніць першароднае імкненне чалавека да прыроды.

Найлепшая музыка для мяне — слухаць шум лістоты старога лесу ці гул марскіх хваляў. Тое ж самае адчуваю пры дакрананні пэндзлем да чароўнай беларускай прыроды, да нашых ціхіх і ласкавых рачулак.

Катарсіс... Слёзы і ачышчэнне ад будзённай марнаты ды набліжэнне да Боскага тварэння дае табе сілу.

"Між Мнютай і Аутай" — так назваў я гэтую выставу, прысвечаную 120-годдзю нашага слыннага мастака Язэпа Драздовіча. Дзве рачулкі, дзве сястры — Мнюта і Аута, між каторымі пралягалі сцежкі дзядзькі Язэпа, заўсёды натхнялі і натхняюць мяне на новыя творы, бальшыня з якіх напісаная ў тых мясцінах гэтым летам.

"Жыві і цэльнасці шукай" — напісаў некалі геніяльны Максім Багдановіч. У пошуках не страшна і заблудзіцца, думаецца мне... Гэта лепей, чым апынуцца ў акамянелай ці забранзавелай "славе".

І вось якія радкі ў памяць вялікага Папярэдніка і Настаўніка ў мяне напісаліся:

Над ціхай Мнютай
Туманы, што вэлюм.
Валёры колераў вячэрняе палітры.
Прывід муроў... Сцяна маўклівых сосен.
Над рэчкай Мнютай
Пралятаюць зоры.
Глухую навіну хавае голас пушчы.
Заблытаўся ў сівых галінах ветах.
Самотна-белы тумановы вэлюм
самотнай постаці гаротнае наверша.
Зламаны падарожны кій...
І круг завершаны.
І не вяшчуе болей над Аутай
зязюля, што яму лічыла леты.
Замкнёны куфар
ціха на планеце.
Схіліўся на пагорку камень-жальнік.
Загублены ключы ад валатовак.
Начніц спалоханых
суцішыць толькі золак.
А скрозь туман
між Мнютай і Аутай
ідуць за ім не ў смутку,
не ў жалобе,
праз Млечны Шлях спасцігнуць
тайну зораў
і расчытаць графічныя ўзоры
нябесных бегаў...
След яшчэ не згублены.
І не прачытана апошняя старонка.
Не збудаваны горад Артаполіс.
Яшчэ не ўсё ўзараў араты поле.
Яшчэ не ўсе размечаны ім межы.
У рыштаваннях вежы
на Трывежы.
Дарогі кужаль
сцежкамі сатканы".



Адкрыццё выставы ў сталічнай галерэі "Мастацтва" (праспект Незалежнасці, 12) сабрала прыхільнікаў прыгожага, сяброў Аляксея Марачкіна. Сярод іх былі і кіраўнікі некаторых дыпламатычных місій у Рэспубліцы Беларусь, якія глыбока цікавяцца культурным жыццём нашай краіны: шведскай — Стэфан Эрыксан, чэшскай — Йіржы Карас, украінскай — Ігар Ліхавы, ізраільскай — Зееў Бен-Ар'е.

Святлана КЛІМЕНЦЕНКА.

На здымках: *мастак Аляксей Марачкін на адкрыцці выставы; краявід "Сцяжынамі дзядзькі Язэпа. Германавічы".*

СЛЫШАЛИ?

Врачи РНПЦ "Кардиология" провели вторую операцию по имплантации искусственных желудочков сердца

Врачи Республиканского научно-практического центра "Кардиология" провели вторую операцию по имплантации искусственных желудочков сердца. Об этом сообщил директор РНПЦ Александр Мрочек.

"Пациентом стал молодой мужчина с диагнозом "дилатационная миокардиопатия". Операцию провели белорусские кардиохирурги с помощью своих коллег из Чехии и Германии", — рассказал Александр Мрочек.

Первая такая операция прошла в январе 2008 года. Тогда искусственные желудочки сердца — сердечные насосы с запрограммированной частотой сокращений — были имплантированы 23-летнему Михаилу Ларину. Камеры искусственных желудочков находятся вне организма, а в грудной клетке — магистрали для забора крови к искусственному желудочку и ее возврата пациенту. Более полугода жизненное пространство Михаила Ларина было ограничено длиной магистралей, соединяющих искусственные желудочки сердца с аппаратом управления и слежения за их работой, находящемся у постели больного. Сейчас Михаил Ларин переведен на портативный аппарат.

Больные с диагнозом "дилатационная миокардиопатия" являются кандидатами на операцию по трансплантации сердца. Это связано со значительным ухудшением работы всех органов вследствие слабости сердечной мышцы и нарушения кровоснабжения всего организма.

Подобные операции выполняются в 30 кардиохирургических центрах мира. К их списку теперь присоединился и РНПЦ "Кардиология".

ВАС ЦІКАВІЦЬ

Дзіцячую сумесь-забойцу шукаюць у Беларусі. Пакуль не выявілі

Трагедыя ў Кітаі, калі з-за ўжывання шкоднага малочнага харчавання загінулі дзеці, устрывожыла ўвесь свет. У Беларусі, як вядома, вельмі шмат кітайскай прадукцыі. А ці паступала да нас гэтае харчаванне?

Марына Арлоўская, г.Бабруйск.

Паважаная Марына, пакуль спецыялісты не могуць даць адказ на ваша пытанне, бо праверка, як сцвярджае галоўны санітарны ўрач Міністэрства аховы здароўя Валянціна Качан, яшчэ ідзе.

У сваю чаргу начальнік упраўлення спажывецкага рынку харчовых тавараў Міністэрства гандлю Любоў Язэпчык паведаміла БелаПАН, што дзіцячае харчаванне з Кітая не імпартуецца. Не імпартуецца і іншая кітайская жывёлагадоўчая прадукцыя. "Уся прадукцыя жывёлагадоўчага паходжання і беларускай, і імпартнай вытворчасці абавязкова праходзіць ветэрынарны кантроль, апрача гэтага, на кожны прадукт выдаецца гігіенічны сертыфікат", — паведаміла Любоў Язэпчык.

ГАЗЕТА — ЧЫТАЧЫ

Вы спазніліся?

І ўсё ж некаторыя з вас, шаноўныя чытачы, не паспелі да пачатку апошняга квартала года аформіць **перадаплату** за кастрычнік—снежань. Рэдакцыя даражыць нашым шчырым сяброўствам і, нягледзячы на гэта, дасылае вам бягучыя нумары газеты. Але, каб у будучым не застацца без "Народнай волі", зрабіце аплату, калі ласка, у бліжэйшыя дні. Пералічыць грошы, ведаеце, можна праз любы філіял "Беларусбанка" ці праз паштовае аддзяленне. Мінчане могуць аператыўна зрабіць аплату таксама праз рэдакцыйны офіс (вул.Энгельса, 34а) альбо пазваніць па тэлефонах: 328-63-93 ці 328-68-71. Пасля званка да Вас прыйдуць нашы валанцёры са свежымі нумарамі газеты і дапамогуць аформіць аплату за любы тэрмін і па любым адрасе. Не маеце магчымасці аплаціць за ўсе нумары, якія выйдуць у кастрычніку — снежні — зрабіце гэта за месяц, два...

Нягледзячы на экстрэмальныя ўмовы выдання газеты, тарыфы па аплаце ранейшыя: на месяц — **9500** рублёў для індывідуальных чытачоў і **15.000** рублёў для арганізацый, прадпрыемстваў, устаноў, фірм. Заўважым: паколькі кошт газеты пры рэалізацыі ў розніцу з новага года павысіўся, то выгадна рабіць **перадаплату**, з тым каб газета дастаўлялася дахаты.

Банкаўскія рэквізіты "Народнай волі" такія:

УП "Народная воля": р/р 3012006535014, ААТ "Пріорбанк", ЦБП 113, код 749, УНН 100961759.

Вымушаны і на гэты раз звярнуць увагу на тое, што **перасылаць у рэдакцыю трэба не толькі копію плацежнага дакумента, але і запоўненую АБАНЕНЦКУЮ КАРТКУ**, узор якой друкуем і ў сённяшнім нумары.

Зноў жа: запаўняйце выразна, пажадана друкаванымі літарамі. Разумеем: для тых, хто рабіць гэта будзе ўпершыню, не вельмі прыемная рэч. Але што зробіш: каб своечасова атрымліваць газету, мы вымушаны звяртацца з такой просьбай.

З дапамогай "Народнай волі" разбудзім усіх абыякавых!

0402280179
ИЗВЕЩЕНИЕ

ИЧУП «Народная воля»
получатель платежа
«Приорбанк» ОАО ЦБУ 113 г.Минск
наименование банка
Счет получателя 3012006535014 Лицевой счет код 749
УНН* 100961759
(фамилия, имя, отчество, адрес)

Вид платежа			Дата	Сумма
Предоплата за июль, август, сентябрь, октябрь, ноябрь, декабрь 2008 г. (ненужное зачеркнуть)				
Плательщик			Пеня	
			Всего	

Кассир

ИЧУП «Народная воля»
получатель платежа
«Приорбанк» ОАО ЦБУ 113 г.Минск
наименование банка
Счет получателя 3012006535014 Лицевой счет код 749
УНН* 100961759
(фамилия, имя, отчество, адрес)

Вид платежа			Дата	Сумма
Предоплата за июль, август, сентябрь, октябрь, ноябрь, декабрь 2008 г. (ненужное зачеркнуть)				
Плательщик			Пеня	
			Всего	

КВИТАНЦИЯ

Кассир М.П.

* Заполняется только при осуществлении операции по уплате налогов.

Абонентская карточка

на номера газеты «Народная воля»
за июль, август, сентябрь, октябрь, ноябрь, декабрь 2008 г.
(ненужное зачеркнуть)

*Заполняется отчетливо **печатными буквами** и **обязательно** отправляется в редакцию с **копией платежного документа***

фамилия

имя **отч.**

индекс почтового отделения

область

район

название населенного пункта

город, городской поселок, поселок, деревня (нужное — подчеркнуть)

улица пр-т переулок *(нужное — подчеркнуть)*

дом *а,б,в,г* **корп.** **кв.**

(Примечание: если можете — укажите, пожалуйста, код подъезда или номер дом.телефона; в случае получения газеты через абонентский ящик обязательно укажите индекс и адрес почтового отделения)

СЛЫШАЛИ?

На дне Байкала обнаружены неизвестные животные

Новые тайны подбросило ученым озеро Байкал. Как мы уже сообщали ранее, на дно озера погрузились аппараты "Мир-1" и "Мир-2" в рамках научной экспедиции по исследованию образцов животного мира. Они подняли со дна озера образцы биологического материала для дальнейшего изучения, и вот теперь готовы первые результаты.

Как пишут российские СМИ, ученым удалось обнаружить нечто неординарное.

По словам старшего научного сотрудника Лимнологического института Сибирского отделения РАН Оксаны Калюжной, "Аппараты "Мир" подняли со дна Байкала образцы голубых губок, которые на сегодня остаются неизученными организмами".

Губки — наиболее примитивные из многоклеточных животных, ведущих неподвижный образ жизни. До погружения "Миров" ученые считали, что губки на дне Байкала белые, однако оказалось, что они там голубые.

"Почему на глубине они голубые — это загадка. Сейчас мы не можем ответить на этот вопрос", — сказала Калюжная. Она не исключила, что поднятые с разных глубин голубые губки окажутся новым видом животных.

Адрас рэдакцыі:
220030, Мінск, вул.Энгельса, 34а.
Прыёмная: тэл./факс (017) 3286871.
Тэл./факс рэкламнага аддзела: 3286904, 3286906
E-mail : nv@promedia.by
http://www.nv-online.info

Заснавальнік і галоўны рэдактар Іосіф СЯРЭДЗІЧ

У сувязі з адсутнасцю магчымасці рэдакцыя матэрыялы не рэцэнзуе і не вяртае, права ўступлення ў перапіску пакідае за сабой. За інфармацыю, размешчаную ў рэкламных аб'явах, рэдакцыя не адказвае. Могуць друкавацца матэрыялы, у якіх пазіцыя аўтараў не падзяляецца газетай. Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №246 ад 10 кастрычніка 1996 г. (пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі №224 ад 6 сакавіка 2000 г.). Надрукавана ў ТАА "Типография Михайлова - С", 214020, г.Смаленск, вул. Шаўчэнкі, 86. Па заказе ТАА "Типография Михайлова", 214000, г.Смаленск, вул. Кастрычніцкай рэвалюцыі, д.38, кв.54. Падпісаны ў друк 01.10.2008 у 17.00. Аб'ём 4 друк. аркушы. Тыраж: 10 026 экз. Заказ №